## ЛІТАРАТУРА


1. Танк, М. Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1978–1981. – Т. 2 : Вершы, паэмы (1945–1954). – 1978. – 464 с.
2. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.


*Казак Ю. А. (Мінск, Беларусь)*

# ПАЭМА А. КУЛЯШОВА «ЦУНАМІ»: ІДЭЙНА-ФІЛАСОФСКІ ЗМЕСТ

*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*

Выдатны ўзор ліра-эпасу – паэма Аркадзя Куляшова «Цунамі» – датуецца 1968 годам. Яго ўзнікненне звязана з праблемамі, што хвалявалі тады аўтара і ўсё чалавецтва (магчымасць новай вайны, пагроза атамнага выбуху, экалагічнай катастрофы і інш.), але філасофская прырода твора робіць яго актуальным у любы час. Адметнасць філасофскай паэмы – ва ўніверсальнасці яе зместу, у магчымасці інварыянтных «дэшыфровак» мастацкай ідэі. У артыкуле прапануем сваю інтэрпрэтацыю ідэйнага зместу паэмы.

У «Цунамі» дзейнічаюць тры ўмоўныя персанажы (Ён, Яна і цынік), светапоглядныя пазіцыі якіх не проста арозніваюцца, але і ўступаюць у канфрантацыю. Закаханая пара, Ён і Яна, злучыўшы свае лёсы, вырашае пакінуць звыклае асяродзе, адмаўляючыся ад «вырабаў зямлі». Яны імкнуцца разам «паласаваць <...> абшары небяспек неспадзяваных». Цынік папярэджвае іх і рэкамендуе ўзяць з сабою ў падарожжа лічыльнік Гейгера, бо «свет пад пагрозай», а таксама гадзіннік. Цынік абрунтоўвае гэта тым, што ў свеце існуюць такія канстанты, якія не знікнуць нават тады, калі іх ігнараваць: «Вы на Зямлі пакінулі гадзіннік, / Але гадзіннік не пакінуў вас» [2].

Папярэджанні цыніка не палохаюць маладых вандроўнікаў і нават выклікаюць смех. Бесклапотных закаханых не пужае і перасцярога чалавека на плыце. Ён, удзячны за дапамогу, прапаноўвае ім прыёмнік, «надзейны сродак, каб дапамогу выклікаць здалёк, <...> альбо ад пільных служб берагавых прыняць паведамленне аб цунамі» [2]. Але вандроўнікі, адчуваючы сябе сам на сам з вечнасцю, лічаць непатрэбным чарговы «забыты выраб зямлі» і таксама адмаўляюцца ад яго.

Закаханыя бестурботна падарожнічаюць, але іх даганяе страшны шторм – цунамі і ўрэшце яны бачаць выбуховы атамны грыб. У выніку вандроўнікі апынаюцца на зямлі: «І хвалі, / Прыкмеціўшы бязлюдны астравок, / Як трэску, лодку іхнюю прыгналі / І выплеснулі ціха на пясок» [2]. Менавіта ў гэты момант маладыя людзі робяць першы крок назад, вяртаючца да пакінутага імі ладу жыцця, да цывілізацыі: «З мінулай явы ў гэтую ўзялі / Яны сякеру, простую апратку, / Зярнят чатыры жмені – для раллі» [2].

Пасля драматычных здарэнняў у жанчыне, што стала Пятніцай для свайго Рабінзона, абудзілася памяць аб аселым ладзе жыцця, загаварыў прагматызм: «Агонь здабыць, азначыць плотам двор – / Аседлы кут, які даўно пара мець. / Даўно пара! Пасля трывожных дзён, / Шаленства бур, злучыўшага іх лёсы, / Ім неабходна засяваць палосы. / Так думала яна» [2]. Абуджаецца і памяць мужчыны, але ён па-ранейшаму адмаўляецца ад яе, не хоча вяртацца да таго, ад чаго ўцякае.

Праз паводзіны герояў у крытычнай сітуацыі адлюстроўваюцца гендарныя асаблівасці псіхалогіі, розніца паміж мужчынскім і жаночым мысленнем. Калі жанчына ўжо была гатова прыняць наступствы цывілізацыйных праблем, не змагацца з лёсам, адмовіцца ад эскапічных ідэй, то мужчына яшчэ мацней загарэўся імі: «Я ветразяў шумлівых не згарну! / Я адшукаю месца, дзе б ні хмары, / Ні цёмныя трывогі не змаглі / Парушыць мар былых» [2]. Гендарны канфлікт, выкліканы несупадзеннем інтарэсаў, узмацняецца праз сутыкненне з прадуктам цывілізаванага свету – прыёмнікам. Жанчына спачатку была рада з'яўленню «вырабу зямлі» ў іх пірозе, але ён прыносіць разлад. Пасля, адчуваючы сваё прыроднае наканаванне быць духоўным цэнтрам іх саюзу, яна робіць першы крок насустрач свайму мараку, скаванага тугою з-за няўдалай спробы загаварыць: «Яна транзістар выключыла ціха / І кінула нячутна за карму» [2].

Хутка маладых вандроўнікаў напаткала асабістая трагедыя, што стала вынікам перыпетый цывілізацыі, ад якой яны ўцякалі – іх дзіця нарадзілася мёртвым: «Спіць сын, руку паклаўшы на руку. / Той выбух, ад каторага ўцякалі \ Бацькі, той смерці атамныя хвалі / Яго дагналі. Тут. На астраўку» [2]. Героі паэмы ўсведамляюць бессэнсоўнасць уцёкаў, немагчымасць існавання па-за межамі законаў, якімі кіруецца чалавечы свет, адчуваюць сваю безабароннасць: «Няма шляхоў да самазахавання, / Няма дарог да светазабыцця / У час ліхі ўзаемапалявання / Сіл супрацьлеглых: смерці і жыцця» [2].

Смерць сына змяняе іх светаўспрыняцце, пазбаўляе раней абранай мэты, становіцца апошнім этапам падарожжа-ўцёкаў, падарожжа, якое, па прадказаннях цыніка, павінна было скончыцца вяртаннем на зямлю: «Мацерыку вяртаў іх акіян / На рэактыўным лайнеры цунамі» [2].

Праз параўнанне цунамі з гневам дарослых, а людзей з дзецьмі А. Куляшоў падкрэслівае бездапаможнасць і немач людзей перад вялікай стыхіяй, непазбежнасць уздзеяння навакольнага свету на жыццё. Аўтар тым самым указвае на немагчымасць жыцця ізалявана ад іншых, а таксама ад набыткаў цывілізацыі. Напрыканцы паэмы ідэя бессэнсоўнасці ўцёкаў дапаўняецца ідэяй асабістай адказнасці. Актуалізуецца тэза «рабі тут і зараз», паказваецца магчымасць чалавека самому ўплываць на жыццё і свет, удзельнічаць у руху цывілізацыі: замест таго, каб шукаць лепшага жыцця дзесьці далёка, можна змяняць рэчаіснасць, рабіць свет лепшым менавіта тут: «Пара за працу. Скончылася эра / Блуканняў адзінокае душы. / – Няма бяросты. / – Знойдзецца папера. / – Няма вугля. / – Карандашом пішы» [2].

У заключнай частцы, «Замест пралога», аўтар малюе карціну ідэальнага існавання, сямейнай ідыліі, якой дасягнулі закаханыя вандроўнікі: «Ён і яна ў цяньку сядзяць, дзе жыта / Шуміць зялёнай хваляй за гумном. <...> / Ганяецца дзіця іх за пушынкай, / Падобнай на жывога матыля» [2]… Гэта думка сугучная назіранням Івана Шамякіна, выказаным у кнізе «Непаўторная вясна» з пенталогіі «Трывожнае шчасце»: «Не адразу ты пачынаеш разумець, што хараство не ў тваіх незямных марах, не ў тваім імкненні да выключнасці, а ў жыцці людзей і што людзі выпрацавалі самае прыгожае, высакароднае, разумнае і ў навуцы, і ў мастацтве, і ў адносінах паміж сабой – у каханні, у сям'і» [3].

Такім чынам, адной з мастацкіх ідэй шматпланавай і шматзначнай паэмы «Цунамі» паўстае праблема адказнасці чалавека за Сусвет: А. Куляшоў паказаў бессэнсоўнасць уцёкаў ад цывілізацыі. У творы, дзе «выразна чуецца дыханне трагедыі» [1, с. 447], аднак, сцвярджаецца вера ў стваральную моц чалавека, у яго здольнасць пераўтвараць свет да лепшага, выпраўляць нават страшныя памылкі, будаваць ідылію сваімі рукамі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Арочка, М. М. Аркадзь Куляшоў / М. М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 3 : 1941–1965. – 2002. – С. 416–478.
2. Куляшоў, А. Цунамі [Электронны рэсурс] / А. Куляшоў // Беларуская палічка: беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Arkadz_Kulasou/Cunami.html. – Дата доступу: 14.09.2018.
3. Шамякін, І. Непаўторная вясна [Электронны рэсурс] / І. Шамякін // Беларуская палічка: беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Ivan_Samiakin/Niepautornaja_viasna.html. – Дата доступу: 14.09.2018.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ